и темперамент действия. Режиссер должен уметь при отборе музыкального материала отказаться от всего, что будет тормозить развитие действия программы.

После составления монтажного листа проводятся прогонные репетиции. Задачей режиссера является предоставление возможности исполнителям ощутить целостное действие, перспективу его развития, почувствовать атмосферу, в которой актер действует, ощутить темпо-ритм действия, проверить точность использования выразительных средств. Режиссеру необходимо выдержать и не останавливать сценическое действие, но отмечать, записывать все свои замечания по ходу этого действия, а также все моменты точного попадания выразительных средств, их слияния в единое непрерывное действие с актером. Замечания режиссер доводит до всех исполнителей, и снова происходит корректировка сценического действия, его темпо-ритма, уточнение и репетиции по замечаниям.

Генеральная репетиция является завершающим, очень важным этапом работы режиссера над воплощением замысла театрализованного представления. На ней должно все происходить так, как на самом представлении со зрителем. После ее проведения режиссер осуществляет анализ всего действия, дает замечания исполнителям или техническому персоналу. В случае необходимости режиссер может назначить отдельные репетиции, после которых проводится вторая генеральная репетиция.

Итогом всей режиссерско-постановочной работы является показ театрализованного представления зрителям, во время которого режиссер может находиться в зале, на сцене, рядом с техническими работниками, т.е. там, где требуют обстоятельства.

После показа режиссер, с учетом восприятия театрализованного представления зрителем, проводит анализ всех достоинств и недостатков программы.

1. Вершковский, Э. В. Режиссура клубных массовых представлений / Э. В. Вершковский. – Л., 1977. – 32 с.
2. Станиславский, К. С. Работа актера над собой / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1951. – 354 с.
3. Станиславский, К. С. Собр. соч.: в 8 т. / К. С. Станиславский. – М. : Искусство, 1953. – Т. 5. – 422 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭТНАКУЛЬТУРА ЯК СРОДАК ДУХОЎНАГА І ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ АСОБЫ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ І Ў ПАЗАКЛАСНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Скарабагатая Н. М.**
*настаўніца беларускай мовы і беларускай літаратуры гімназіі № 61 г. Мінска*

***Анатацыя***. *У артыкуле разглядаецца праблема ўплыву ведаў па этнаграфіі Беларусі на цікавасць вучняў да вывучэння прадмета беларускай мовы і літаратуры, на маральнае і інтэлектуальнае развіццё асобы. Прадстаўлены метадычныя падыходы аўтара да распрацоўкі пазакласных мерапрыемстваў, накіраваных на далучэнне вучняў да феноменаў беларускай этнічнай культуры ў мэтах іх духоўнага ўзбагачэння.*

***Summary***. *The article touches upon the influence of the knowledge of Belarusian ethnography on the students' interest in studying the Belarusian language and Belarusian*

*literature, on the moral and intellectual development of a personality. It also represents methodological approaches of the author to the planning of out-of-class activities, which are aimed at the involvement of the students in the phenomenon of Belarusian ethnic culture with the purpose of their spiritual enrichment.*

Сёння педагагічную грамадскасць хвалюе пытанне, якім будзе новае пакаленне ў духоўна-маральным плане. Відавочна, мы павінны навучыць маладых людзей зарабляць грошы і жыць самастойна, і, разам з тым, заставацца людзьмі ў самым шырокім сэнсе гэтага слова. Нарматыўныя прававыя дакументы ў галіне адукацыі ставяць задачу фарміравання творчай асобы, здольнай арганічна ўпісацца ў сусветную культуру і цывілізацыю. Выхаванне такой асобы, на нашу думку, магчыма толькі на этнакультурнай глебе, бо ўсе каштоўнасці, створаныя чалавекам, – гэта і ёсць адлюстраванне своеасаблівага бачання свету творчай асобы праз прызму нацыянальнага характару.

Этнакультура ёсць сукупнасць духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, створаных прадстаўнікамі пэўнага этнасу ў працэсе грамадска-гістарычнай дзейнасці. Беларуская этнічная культура – гэта цэласная сістэма, у якой усе падсістэмы і элементы (рэлігія, міфалогія, абрады, фальклор, ужытковае мастацтва, дыялектная ці гутарковая мова) арганічна ўзаемазвязаны.

Нідзе так поўна не выяўляецца душа і характар народа, як у фальклоры, традыцыях, абрадах, музыцы, мове. І разам з тым гэта ўнікальны матэрыял, у якім адлюстравана народная педагагічная культура. На жаль, сучасная сям’я не з’яўляецца ні носьбітам, ні захавальнікам народнага педагагічнага вопыту. Менавіта школа і прызнана адрадзіць лепшыя традыцыі народнай педагогікі беларусаў.

Беларуская народная педагогіка сфарміравалася адначасова з утварэннем і развіццём беларускай этнічнай супольнасці, народнасці, нацыі і з’яўляецца вельмі важнай, неабходнай часткай культуры, значэнне якой з цягам часу не змяншаецца, а, наадварот, узрастае.

Праблема набліжэння сучаснай школы, яе выхаванцаў да скарбаў беларускай этнакультуры разглядаецца ў працах прадстаўнікоў педагагічнай навукі і практыкі Г. Арловай, Г. Барташэвіча, А. Грымаця, І. Калачовай, С. Снапкоўскай і інш. Аўтары пераканаўча сцвярджаюць, што беларуская народная педагогіка ўяўляе сабою цэласную сістэму выхавання. Яна выпрацавала прагрэсіўныя мэты, эфектыўныя формы і спосабы, змястоўныя, багатыя сродкі выхавання асобы, якія вытрымалі выпрабаванні стагоддзямі, не страцілі свайго значэння і сёння.

Найбольш важнай мэтай беларускай народнай педагогікі з’яўляецца выхаванне чалавека як працаўніка, фарміраванне належных адносін да працы, погляду на працу як галоўнейшую сферу чалавечай дзейнасці, аснову нармальнага, здаровага жыцця. Другая вельмі важная мэта народнай педагогікі – фарміраванне высокамаральнага чалавека з беражлівымі, клапатлівымі адносінамі да прыроды як неабходнай умовы добрага жыцця, выхаванне чалавека, які ўзгадняе свае асабістыя інтарэсы з інтарэсамі іншых, перш за ўсё ў сям’і, затым у больш шырокай супольнасці – абшчыне, вясковай і гарадской, і, нарэшце, з інтарэсамі ўсёй этнічнай супольнасці, усяго народа, інтарэсамі сваёй Радзімы.

Ідэалам народнай педагогікі з’яўляецца асоба, якая дбае не толькі пра свой дабрабыт, дабрабыт сваіх блізкіх, але і пра дабрабыт свайго народа, сваёй Радзімы. Выхаванне чалавека-патрыёта – адна з важнейшых мэт народнай педагогікі. Адначасова народная педагогіка імкнецца выхаваць чалавека, які паважліва адносіцца да людзей другіх этнічных супольнасцей, што адрозніваюцца асаблівасцямі сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культуры, характарам, гістарычнымі каранямі, поглядамі, перакананнямі. Народная педагогіка звяртае належную ўвагу і на фарміраванне асобы, якая добра ўспрымае, цэніць і любіць прыгажосць у жыцці, прытым не толькі святочным, але і штодзённым, асобы, якая сама ўмее рабіць яго ўмовы прыгожымі.

Народная педагогіка на працягу стагоддзяў назапасіла шмат каштоўных форм і спосабаў выхавання. Да іх адносіцца назіранне, паказ, прыклад, практычная дзейнасць, павучанне (настаўленне), парада, ухваленне або асуджэнне і інш. Важнейшым і самым эфектыўным спосабам выхавання з'яўляецца практычная дзейнасць дзяцей, іх удзел у гаспадарчых працэсах (напрыклад, занятках мастацкімі промысламі, рамёствамі), у святах, абрадах, іх падрыхтоўцы і правядзенні, занятках народнай музыкай, харэаграфіяй і інш. Менавіта дзеянне – асноўны і самы эфектыўны спосаб выхавання, які моцна ўплывае і на пачуцці, і на погляды, звычкі, на асобу ў цэлым.

Народная педагогіка назапасіла таксама багатыя сродкі эфектыўнага выхавання асобы. Імі з'яўляюцца феномены этнаграфічнай культуры: прылады працы, мастацкія вырабы, напрыклад, нацыянальнае адзенне, гульні, фальклор, мова і інш. Нацыянальнае адзенне, у прыватнасці, не толькі яркая мастацкая з'ява, якая злучае асобу з гісторыяй этнічнай супольнасці, паколькі шмат якія рысы нацыянальнага святочнага адзення сфарміраваліся на працягу стагоддзяў. Нацыянальнае святочнае адзенне захоўвае памяць пра мінулае, выконвае ролю нацыянальнага сімвала, які яднае людзей адной этнічнай супольнасці.

Сінкрэтычным выхаваўчым сродкам з'яўляюцца народныя гульні. У гульнях фарміруюцца неабходныя фізічныя якасці асобы (хуткасць рухаў, спрыт, вынослівасць, фізічная сіла). З іх дапамогай развіваецца і шэраг станоўчых рыс характару: мэтанакіраванасць, настойлівасць, смеласць, выхоўваецца разуменне неабходнасці агульных правілаў, узаемных абавязкаў і ўзгодненых калектыўных дзеянняў, узаемавыручкі, фарміруюцца патрэбныя таксама для асобы інтэлектуальныя і творчыя якасці (здольнасць да імправізацыі, фантазія, уяўленне).

Да вельмі змястоўных сродкаў адносіцца беларускі фальклор (песні, казкі, паданні, прыказкі, прымаўкі). Ён адзін з багацейшых на свеце, па-мастацку дасканалы, выклікае пачуццё гонару за свой народ, з'яўляецца духоўным стымулам карыснай для Радзімы дзейнасці, трывалым падмуркам нацыянальнай свядомасці.

Вялікія выхаваўчыя магчымасці мае такі сродак народнай педагогікі, як беларуская мова. Гэта найвялікшы духоўны скарб. У ім добра адлюстравана беларуская гісторыя, мясцовае прыроднае асяроддзе, асаблівасці мастацкага мыслення, характару беларускага народа. Карыстанне роднай мовай з'яўляецца арганічным сродкам выхавання любові да свайго народа, Радзімы, самапазнання гістарычнай і культурнай своеасаблівасці, уласнага месца ў свеце, у культуры чалавецтва.

Такім чынам, літаратура, беларуская песня, абрады, звычаі, традыцыі – усё багацце этнакультуры – павінны існаваць побач, толькі тады яны пранікнуць у душу, сэрца вучня, стануць той крыніцай, з якой можна ўвесь час чэрпаць фізічныя і маральныя сілы. Таму я акрэсліла для сабе, як настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, асноўную задачу: абудзіць у вучняў цікавасць да роднай зямлі, да сваёй мовы і даказаць, што мы, беларусы, не горшыя за іншых, народ з багататай культурай. У наш шалёны век, век камп'ютарных тэхналогій, выплысці з віру бездухоўнасці, бескультур'я можна трымаючыся за матэрыяльную і духоўную спадчыну, як за выратавальны круг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы крок на гэтым шляху – аформіць кабінет роднага слова. На кожны ўрок прыходзілі вучні сюды, а ён звычайны, «шэры», як і іншыя. Трэба нешта зрабіць, каб цёпла і ўтульна пачувалася ў ім, як у беларускай хаце. Разам з вучнямі збіралі прылады побыту, вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Колькі радасці было, калі да пачатку навучальнага года ў кабінеце з'явіўся этнаграфічны куток. Даўно заўважыла, што больш за ўсё людзі берагуць і цэняць тое, што зроблена сваімі рукамі. Дзеці вельмі беражліва адносяцца да рэчаў, якія захоўваюцца ў нашым кутку. Кожную добра ведаюць, пра кожную могуць шмат чаго расказаць. Вучні па-новаму пачынаюць глядзець на быццам бы звычайныя паўсядзённыя рэчы, вучаццца кожны выраб, кожную прыладу ацэньваць з мастацкага боку, знаходзіць прыгожае ў самым празаічным. Падчас правядзення тыдня беларускай мовы і літаратуры вучні старэйшых класаў запрашаюць у этнаграфічны куток пачатковую школу і самі праводзяць цікавыя экскурсіі.

Традыцыяй у нас ужо стала правядзенне Свята нацыянальнай кухні, якое мы арганізоўваем у школьнай кавярні. Незвычайную весялосць выклікала рэклама тавараў, якія былі выстаўлены на кірмашы. Сапраўды, тут вучні паказалі сваю кемлівасць і вынаходлівасць. Вось, напрыклад, рэклама 9 класа:

Страву беларускую
Мы прыгатавалі.
Прапануем, каб і вы
Яе пасмакавалі.
Страва называецца
«Ранішняе сонца».
Няхай яно загляне
І ў ваша аконца.

Традыцыі народнага мастацтва знаходзяць сваё практычнае прадаўжэнне на школьным кірмашы, дзе вучні прапаноўваюць нашай увазе разнастайныя вырабы з саломы, дрэва, вышываныя вырабы, многае іншае. Усё гэта дае магчымасць не толькі глыбей спасцігнуць сакрэты таго ці іншага рамяства, але і вырашыць вельмі балючую сёння праблему пераемнасці традыцый.

Знаёмства з творчасцю сваіх продкаў, якія з простых, звычайных матэрыялаў ствараюць сапраўднае мастацтва, міжволі выклікае пачуццё гонару за сваю зямлю, родны край, дзе нараджаюцца такія таленты.

У сваёй практыцы вялікую ўвагу вучняў звяртаю на народныя святы. Традыцыйна ў гімназіі з вялікім поспехам праходзяць святкаванні Саракоў, Калядак, Дажынак. Такія мерапрыемствы мэтазгодна праводзіць у 5–7 класах. Для вучняў старэйшых класаў прапаную пагаварыць пра этнамоду.

Імкненне радаваць сваім знешнім выглядам – адна з форм павагі, абавязковая для выхавання чалавека. Асэнсаванню эстэтычнай ролі свайго знешняга выгляду можа дапамагчы зварот да этнакультуры беларускага народа. Тады творчы вопыт стварэння і мастацкага аздаблення адзення, які захоўваўся ў вяках, стане асновай для разумення вучнямі «добрага ў модзе» і «моды на добрае». Педагагічны патэнцыял садзейнічае фарміраванню ўяўлення аб сапраўднай прыгажосці чалавека, развіццю эстэтычнага густу, адчуванню прыналежнасці да этнакультуры свайго народа, выхоўвае творчы падыход і пачуццё меры ў адносінах да моды.

Мерапрыемства разлічана, як адзначалася раней, на вучняў старэйшых класаў. Яно можа праходзіць у форме вуснага часопіса на тэму «Этнакультура і мода». Спачатку вучням прапануецца даследаваць асаблівасці і элементы беларускага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнага адзення. Затым паназіраць за стылем адзення: дзяцей, моладзі старэйшага пакалення. І, нарэшце, абмеркаваць такія пытанні: як часта і з якой мэтай у сучасным адзенні выкарыстоўваюцца элементы фальклору? Ці ёсць людзі, якія мэтанакіравана выкарыстоўваюць элементы фальклору пры стварэнні сучаснага адзення? Адзенне з якіх тканін зараз у модзе? Чым яно звязана з этнакультурай беларусаў? Што вам падабаецца ў беларускім нацыянальным адзенні?

Можна правесці таксама прэзентацыю дзявочых прычосак, якія захаваліся ў этнакультуры беларусаў, альбо паказ мадэляў сучасных прычосак з выкарыстаннем традыцыйных элементаў. Вучні з вялікім задавальненнем прымаюць удзел у такіх мерапрыемствах.

Такім чынам, фарміраванне ведаў па этнаграфіі Беларусі спрыяе цікавасці вучняў да вывучэння прадмета беларускай мовы і літаратуры, стварае падмурак для маральнага і інтэлектуальнага развіцця асобы. Цывілізаванасць народа вызначаецца не толькі ўзроўнем развіцця эканомікі і сацыяльнага дабрабыту, але і адносінамі чалавека да культурнай спадчыны продкаў. Без ведання сваіх вытокаў, сваіх каранёў людзі не могуць ацаніць тое, што маюць. Веданне традыцый, абрадаў, фальклору свайго народа ўзнімае нас на новую прыступку духоўнага развіцця. Таму школа сёння прызвана стаць захавальнікам духоўных і матэрыяльных набыткаў, паколькі займаецца выхаваннем грамадзяніна. Каб выканаць гэтую місію, яна павінна абапірацца на лепшыя дасягненні і набыткі народнай педагогікі.

# ВОЗМОЖНОСТИ КУРАТОРСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В ФОРМИРОВАНИИ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ БУДУЩИХ СПЕЦИАЛИСТОВ СКД

**Славина Е. В.**
*преподаватель кафедры педагогики социокультурной деятельности Белорусского государственного университета культуры и искусств (г. Минск)*

***Аннотация.*** *Автором статьи выявлены возможности для формирования профессиональной самосознательности будущих специалистов социокультурной деятельности в рамках работы куратора учебной группы.*

***Summary.*** *The author of the article identifies the opportunities for future professional self-consciousness of the future socio-cultural activity specialists within the curriculum of the training group.*

Социальные, экономические, политические и культурные изменения, происходящие в Республике Беларусь в сфере профессиональной подготовки специалистов, повлекли за собой существенные изменения в системе высшего образования. Сегодня актуализируется потребность в компетентных специалистах, профессий, влияющих на развитие личности и общества в целом. К ним относится и профессия специалиста социально-культурной сферы, деятельность которого предполагает наличие широкого спектра психолого-педагогических знаний и требует высокого уровня развития профессионального самосознания. Высокий уровень его развития позволяет человеку быть внутренне свободным в выборе и достижении профессиональных целей, что способствует более полной реализации своего внутреннего потенциала. В тоже время, из-за недостаточного внимания к

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ